Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem

Беларускі Звон

Радыкальная тыднёвая часопісь

Цана асобнага нумару 20 гр.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Лiпоўка 18.
Адрэс для карэспандэнцыі і падпіскі: паштовая скрынка № 19.
Прыймо інтэрэсэнтаў ад 10 да 2 гадз. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.
Падпіска з дастаўкай да хаты: на 1 год—6 зл., за паўгоду—3 зл., за 3 мес. — 2 зл., за 1 мес.—50 гр.

Год І. Вільня, 27 студзеня 1931 г. № 2

Савецкія палітычныя працэсы.

За апошнія гады даволі часта прыходзіцца спатыкацца ў Савецкім жыцьці з такімі фактамі, як вялікія палітычныя працэсы, у якіх на лаве абвінавачаных знаходзяцца найлепшыя інтэлігэнтныя сілы. Нядаўна, як ведама ўсім, закончыўся працэс г. зв. Прамысловай Партыі, аб якім савецкія газэты пісалі, як аб нейчым надзвычайным у значэньні „злое волі„ абвінавачаных.

Хутка, відаць, будзе разглядацца справа „беларускіх контр-рэвалюцыянэраў" і нацыянал-дэмакратаў: Лёсіка, Некрашэвіча, Пічэты, Гарэцкага і шмат іншых культурных беларускіх сілаў.

Не забыліся маскоўскія камуністы пасадзіць у лёхі чрэзвычайкі і такіх пісьменьнікаў, як Дудар, Зарэцкі, Пушча і іншыя.

Усе падобныя факты мімаволі насоўваюць пытаньне: што фактычна крыецца за гэтымі працэсамі?

Адказу на пастаўленае намі пытаньне трэба шукаць у вытварыўшымся ў Савецкай дзяржаве эканамічным палажэньні.

Дзякуючы розным партыйным ухілам з перагібамі, а галоўнае, дзякуючы самому факту існаваньня дыктатуры Кампартыі, паказаўшай поўную няздольнасьць да кіраваньня сацыяльна-эканамічным і грамадзкім жыцьцём,—Савецкія рэспублікі стаяць на пярэдадні поўнай эканамічнай катастрофы.

Пасьля 13-гадовага гаспадараваньня, камуністычная партыя давяла край да таго, што няма нават чаго есьці: галодныя і абадраныя натоўпы людзей стаяць каля савецкіх крамаў і вяртаюцца да хаты з пустымі рукамі.

Зразумела, што такое палажэньне адбіваецца на настроях на'т самай оптымістычнай часткі савецкага грамадзянства. Нарастаець агульнае незадаваленьне, якое можа выліцца зусім нечакана для камуністычнай дыктатуры ў тое, што ўжо было ў Расеі ў сакавіку 17 году.

Голад і холад можна цярпець год, два, а можа і крыху балей пры ўмове, што ёсьць надзея на палепшаньне ў бліжэйшай будучыні. Калі-ж народ траціць гэтую надзею, калі ён пераконваецца, што палажэньне пагаршаецца і няма абсалютна ніякай надзеі на яго палепшаньне, — тады ён траціць даверра да таго ўраду, які карміў яго ўвесь час абяцанкамі. І вось цяпер мы бачым як раз той мамэнт, калі „Савецкі народ" пачаў пераконвацца ў бязвыхаднасьці палажэньня пры сучасных палітычных умовах жыцьця.

Для камуністычных валадароў СССР у сваю чаргу наступіў такі мамэнт, калі сталася неабходным адвярнуць увагу „масаў" ад гэтага грознага стану рэчаў і скіраваць яе ў іншы бок.

Катастрофальны стан у галіне савецкай эканомікі трэба было вытлумачыць перад гэтымі масамі ня тымі асноўнымі недарэчнасьцямі, якія зьвязаны з сучасным ладам у Саветах, а „злою воляю" і „шкодніцтвам" тых „контр-рэвалюцыйных" сілаў, якія за ўсялякую цану імкнуцца да таго, каб савецкае грамадзянства заўсёды было ня толькі галодным, але і босым і голым. Ухапіўшыся за такую шчасьлівую думку, камуністычнай партыі вельмі лёгка было зрабіць адпаведныя вывады і дарабіць усё тое, чаго вымагалі „заданьні дня".

А робіцца гэта пры савецкіх умовах вельмі лёгка: націск па лініі Г. П. У. — і машына пайшла ў рух.

Ловяць інжынераў і тэхнікаў, садзяць за краты Лёсікаў, Некрашэвічаў, беларускіх пісьменьнікаў і наагул кагэ папала, а пасьля зьбіраюць на сходы галодных і абадраных людзей і кажуць ім: „Вось дзе прычына вашых няшчасьцяў! 13 гадоў мы стараліся стварыць для вас райскія ўмовы жыцьця, і роўна 13 гадоў гэтая контр-рэволюцыйная сволач займалася толькі тым, што падрывала нашу працу дзеля таго, каб вы галадалі і сядзелі ў холадзе!"

Вінавайцы знийодзены і ўвага атуманенай і зьбітай з панталыку масы адвернена ў іншы бок...

Недарма ўсе савецкія газэты падчас працэсу „Промпартыі" запаўняліся абшырнымі справаздачамі аб гэтым працэсе, недарма па радзё разносілася кожнае слова пракурора і ўсіх тых, хто браў учасьце ў гэтай трагікамэдыі...

Утапаючы хапаецца на'т за саломінку. Такою саломінкай для камуністычнай дыктатуры зьяўляюцца працэсы, падобныя да тых, якія адбываліся і да такога, які хутка адбудзецца над беларусамі ў Менску.

Хутка, аднак, і гэтую „хітрую мэханіку" камуністычных дыктатараў зразумеюць працоўныя масы, а тады... парвецца і тая саломінка, за якую компартыя пакуль што трымаецца.

Аблічча праўды.

Бываюць у жыцьці грамадзянстваў мамэнты, калі—пад уплывам нейкага яркага здарэньня — з вачэй людзкіх спадае доўга закрываўшая іх павязка, і тая прыкрая праўда, ад якое людзі стараліся неяк адвярнуцца, каб яе ня бачыць, раптам адкрывае перад усімі сваё аблічча.

Такі мамэнт пераживае сяго нья польскае грамадзянства. Пад уплывам глыбокага маральнага ўстрасеньня, якое зрабілі берасьцейскія падзеі, навет тыя асобы, якія йшчэ так нядаўна гатовы былі ідэалізаваць польскую палітыку на тak званых „крэсах",—перад усім—на землях Беларускіх, цяпер бачаць у ёй не адну цёмную пляму.. І калі тыя-ж самыя асобы „разграшалі" тутэйшых „да-маёвых" адміністратараў з усіх тых страшэнстваў, што ў нас рабіліся і маглі зацьміць навет „Берасьце", апраўдываючы іх „вялікай культурнай місіяй" Польшчы на цёмных і заняпалых „крэсах", — дык цяпер паддаецца балючай для польскага нацыянальнага „гонару" крытыцы самая сутнасьць гэнае „культурнае місіі".

У часопісі „Кур'ер Варшаўскі" з 24 сьнежня 1930 году надрукавана стацьця пана Кінёрскага, б. сэнатара і б. старшыні цэнтральнага сельска-гаспадарчага таварыства — гэтага галоўнага асяродку эканамічнае сілы польскіх абшарнікаў. Стацьця мае назоў: „Запраўдная і фальшывая культура"—і гаворыць імення аб тэй „культуры", якую Польшча ў працягу 12 гадоў „насаджае" на землях Заходняе Беларусі.

Вось, што піша пан Кінёрскі ў памянёнай стацьці аб Заходняй Беларусі:

„Вось ужо 12 гадоў мінае, як зямля гэтая сталася складовай часткай гаспадарства, каторае прадстаўляе ідэю заходняе культуры. А ўсё-ж цяжка дагледзіць тутака сьляды польскае цывілізацыйнае місіі, бо тып жыцьця людзкога ўсьцяж астаецца на першабытным роўні натуральнае гаспадаркі. І гэтае зьявішча яшчэ дзіўнейшае, калі ўсьвядомім сабе, колькі за гэтыя 12 гадоў выдана ўставаў, маючых на мэце ашчасьліўлівіць крэсавае насяленьне, колькі рэфэратаў напісалі на гэтую тэму чыноўніцкія пёры, колькі разоў зьмяняліся сыстэмы гаспадараваньня над гэтым насяленьнем і якія заўзятыя спрэчкі вяліся аб прынцыпах, каторыя мелі забясьпечыць гэтаму насяленьню ўсебаковае духовае і матарыяльнае разьвіцьцё! І запраўды-ж, вельмі шкада, што ў пагоні за гэтымі ідэальнымі дабрадзействамі забываліся аб рэчы найважнейшай, а імення аб тым, каб навучыць гэтае насяленьне вырабляць зямлю так, каб яно перастала недаядаць і здабыла хоць першую, скромную ступень дабрабыту... Спрадвечны зямельны лад астаецца ўсё на старым роўні—з тэй толькі рожніцай, што ён прыдаўлены цяжарам нязнаных даўней ды ўсьцяж узрастаючых грамадзкіх абцяжэньняў і выклікае яшчэ большую беднату і ўпадак земляробскае людьнасьці"...

Пан Кінёрскі вывез з свайго аб'езду „крэсавых" земляў „проста прыгнятаючае ўражаньне". Ён рашуча заяўляе, што і надалей „непрадукцыйнасьць крэсавых земляў будзе трываць — ажно пакуль дзяржаўная ўлада не зразумее, што паднясьце вытворчых сілаў насяленьня павінна стацца галоўным пунктам сыстэмы ўпраўленьня". А тымчасам „дзяржаўная ўлада выдае вялізарныя сумы на інвэстыцыі, якія на мой пагляд зьяўляюцца непатрэбнымі, ці прынамся перадчаснымі". І аўтар далей дае прыклад, як урад на нашых землях будуе на чыгунках не вагзалы, а проста палацы, якіх нямашака на вельмі рухлівых пунктах заграніцай: там, наадварот, у такіх пунктах працуе адзін урадовец—начальнік станцыі, які і білеты прадае, і пераставляе стрэлкі на чыгунцы, і выпаўняе шмат іншых чыннасьцяў. „Процілежнасьць паміж галітой ваколіцы і пышнасьцяй казённых будынкаў яшчэ ярчэй выяўляецца ў мястовых асяродках", кажа аўтар і падае, як прыклад, „палацы", пабудаваныя для староства і іншых урадавых установаў у Маладэчне — побач з беднымі, заняпалымі хатамі мясцовага насяленьня ў мястэчку. На што гэтае марнаваньне грошы мясцовага насяленьня? І—„каму могуць заімпанаваць гмахі, будаваныя коштам беднае ды нярэдка галадаючае людьнасьці"? Народу беларускаму яны напэўна не заімпануюць, а хіба выклічуць у яго зусім непажаданыя для Польскае дзяржавы пачуцьці: „Калі бедны беларускі мужык, уваходзячы ў муры староства проста з свае ўбогае хаціны, мо' завідуе ўрадоўцам, працуючым у атмасфэры новачаснага камфорту,—дык баюся,—кажа п. Кінёрскі,—што на дне ягонае душы крыецца ненавісьць да людзей, якія карыстаюцца дабрадзействамі культуры"... І павадыр абшарнікаў канчае сваё апісаньне таго, што бачыў у Заходняй Беларусі, гэткім пажаданьнем:

„Наколькі-ж іншымі былі-б пачуцьці беларусаў, калі-б з гмахаў менш пышных, але больш датарнаваных да нізкое ступені крэсавага жыцьця, ішлі ў вёскі прадстаўнікі польскага ўраду ня толькі дзеля таго, каб спаганяць залеглыя падаткі ці накладаць штрафы за небяленьне вапнай збудаваных з бярвеньняў хат, а дзеля навучэньня яго, ...як павінен гаспадарыць, каб мець што есьці, у што апранущца, ды мець людзкое жыльлё". Вынікі такое працы польскіх урадоўцаў „былі-б выдатнымі і трывалымі—так, як трывалым зьяўляецца дзеяньне запраўднае культуры ў параўнаньні з культурай фальшывай, якая грунтуецца на вонкавых бліскучых знаках".

„Трэба зрабіць вывад, што найхарашэйшыя будоўлі, кіданыя на фоне агульнае галіты, не насунуць культурнага жыцьця крэсаў ані на крок". Патрэбна запраўдная карысная для тутэйшага народу творчая праца, але... аб такой працы нешта мала чуваць...

Мо' збуджанае цяпер сумленьне польскага грамадзянства прымусіць урэшце тых, ад каго гэта залежыць, каб Польская дзяржава ўзыйшла ўрэшце на шлях такое працы!

Даўно на гэта пара. Иав. Фальчевіч.

Ад Прэзыдыюму Беларускага Цэнтрасаюзу.

Прэзыдыюм Беларускага Цэнтрасаюзу гэтым зьвяртаецца да ўсіх беларускіх арганізацыяў і інстытуцыяў, якія яшчэ не ўвайшлі ў сябры гэтага Саюзу і якія спачуваюць яго мэтам, каб зрабілі гэта ў бліжэйшы час.

Трэба памятаць, што ў аб'яднаньні — сіла і шчо гэтая сіла нам патрэбна для працы над нацыянальным і культурным адраджэньнем нашага народу.

Статуты і розныя спраўкі будуць высланы на запатрэбаваньне, якое скіроўваць па адрасу: Wilno, Ostrobramska 9, m. 22.

ПРЭЗЫДЫЮМ.

Чарговае заданьне.

У сучасным грамадзянстве абставіны зло̀жыліся так, што чалавек ад маманту яго нараджэньня аж да самай сьмерці знаходзіцца пад апекаю царквы. Яна—у пэўных выпадках выконвае у нас тое, што ў шмат якіх дзяржавах выконваецца сьвецкімі ўстановамі (запісы нарадзін, жаніцьбы, сьмерці). Галоўнаю, аднак, сваёю задачаю царква лічыць ня выкананьне тых фармальнасьцяў, якія з пасьпехам могуць выконваць іншыя ўстановы,— а духоўнае ўзгадаваньне. Гэтым царква і займаецца ад самай раньняй пары жыцьця чалавека ажно да сьмерці.

Кожны народ, які мае сваю асобную мову— атрымоўвае гэтае ўзгадаваньне ў сваёй роднай мове. Ён мае свае духоўныя кніжкі, напісаныя ў роднай мове; ён чуе ў царкве пропаведзі ў той мове, якая бліжэй гаворыць яму да сэрца; урэшце самі сьвяшчэньнікі карыстаюцца тэй мовай, якая зьяўляецца роднаю для іх прыхаджанаў. Гэтае зусім нармальнае зьявішча даецца ўва ўсіх краёх: у Англіі біблію чытаюць у ангельскай мове, і вельмі зьдзівіліся-б ангельцы, каб пачулі пропаведзь свайго пастара ў нейкай іншай, неангельскай мове, хаця-ж бы і блізкой да яе. Ня ведаем, што пачалося-б у каталіцкім касьцеле ў нейкім Калішу, калі-б на амбону ўзлез ксёндз і пачаў гаварыць перад прыхаджанамі-палякамі казаньне, прыкладам кажучы, у беларускай мове?!.

Усё гэта такія зразумелыя рэчы, на якіх ня варта нат доўга затрымлівацца. Аднак-жа тое, што зусім зразумела ў іншых народаў і што робіцца там згодна з законамі здаровага розуму — зусім інакш выглядае ў нашых беларускіх умовах жыцьця пад Польшчай.

У беларускай вёсцы, дзе і дзяды, і прадзяды былі адвечныя беларусы, як нармальнае зьявішча, наглядаецца тое, што выклікала-б вялікае абурэньне сярод іншых культурных і нацыянальна-сьвядомых народаў.

У нас па заведзенаму звычаю выходзіць на амбону праваслаўны сьвяшчэньнік, пачынае павучаць „братію“, зусім не зьвяртаючы ўвагі на тое, да якога этнічнага „парадку“ належыць яго „паства“. „Нічтоже сумняшеся—рэжа сабе па расейску, забываючыся аб тым, што ўжо даўно мінулі тыя часы, калі царква была праваднікам абмаскоўліваньня. І што яшчэ характэрна ў гэтым абмаскоўліваньні, дык гэта тое, што сучаснае праваслаўнае духавенства—па загаду свае духоўнае ўлады, дэманстрацыйна топча правы беларускага народу на сваю мову, залічаючы яго да расейцаў і наагул адмаўляючыся прызнаць самаіснаваньне „кокихъ-то бѣларуссовъ“.

З гэтага ўсяго вынікае адно — царква пры сучасным стане рэчаў калечыць душу нашага народу, дэнацыяналізуе яго і імкнецца да грубага абмаскоўліваньня, на якое, здавалася-б, даўно ўжо павінна прайсьці мода.

З другога боку наглядаюцца і іншыя ня менш сумліўныя зьявішчы.

У тых мясцах, дзе беларусы вызнаюць каталіцкую веру, ксяндзы таксама не прызнаюць беларускай мовы і накідаюць праз касьцёл свайй „пастве“—„польшчызну“.

У выніку гэтых атакаў з двух бакоў—сярод адзінага беларускага народу, які падзяліўся на праваслаўных і каталікоў, паглыбляецца прорва, павялічваецца ўзаемнае недаверра і гэтым самым пашыраецца дэмаралізацыя.

Гэтым важным з грамадзкага пункту гледжаньня пытаньнем павінны зацікавіцца ня толькі тыя, хто займаецца г. зв. духоўнымі справамі, але да іх вырашэньня павінна падыйсьці ўсё нашае грамадзянства; бо запраўды ў гэтай „сфэры“ творацца такія рэчы, якіх трудна знайсьці сярод іншых народаў. Нашы браты ўкраінцы ўжо даўно вырашылі гэтае пытаньне, і царква там з'украінізавана. Той духоўны, які асьмеліўся-бы праводзіць праз царкву абмаскоўліваньне, ня меў-бы прыхаджан.

Толькі ў нас засталіся гэтыя сумныя рэчы.

Дэмаралізацыю ўносіць у наш народ тая палітыка, якая праводзіцца дасюль польскімі ўладамі ў справе веравызнаньня. Дык-жа трэба, каб само нашае грамадзянства, апусьціўшыся з паднябесься „высокай палітыкі“, занялося гэтымі „дробнымі“ справамі, якія ў канцы канцоў маюць не такое ўжо дробнае значэньне.

Барацьбу за беларускасьць царквы і касьцёлу трэба пачынаць безадкладна.

Справіўшыся з адною бядою,—набяром сілаў для барацьбы і з іншымі, якія таксама падточваюць жывыя сілы нашага народу.

Ад Рэдакцыі. Горача падтрымліваючы заклік аўтара гэтае стацьці да грамадзянства, Рэдакцыя лічыць сваім абавязкам адзначыць, што пэўнымі групамі і грамадзкімі арганізацыямі (Беларускі Царкоўны Камітэт), а такжа паасобнымі адзінкамі ад нейкага часу вядзецца акцыя на карысьць увядзеньня беларускае мовы ў царкву. На жаль, шырэйшыя колы грамадзянства выяўляюць лішне мала зацікаўленьня гэтай акцыяй, а партызанцкія выступленьні некаторых, мо лішне гарачых адзінак, робленыя датаго-ж ананімна, маюць такі характар, што ня толькі не дасягаюць сваей мэты, але выклікаюць шкодныя рэзультаты. Мы маем тут на думцы аднадвёўку пад назовам „У імя праўды“, выданую ў сьнежні мінулага году, якая бруднымі і часта зусім неабаснаванымі інсынуацыямі па адрасу ворагаў беларусізацыі царквы, толькі абніжае вагу зьмешчаных у аднадвёўцы рэчовых закідаў. Такі шлях і да мэты не вядзе, і ўзнаўляе даўно ўжо засуджаныя ідэйным беларускім грамадзянствам брудныя мэтады барацьбы з палітычнымі працаўнікамі.

Палітычнае жыцьцё.

Польшча.

Сойм і Сэнат.

Сэсія заканадаўчых палатаў узнавілася пасьля Каляд 13 г. месяца.

Яшчэ раней узнавілі працу розныя камісіі Сойму—на чале з бюджэтнай. У Сойм паступіла 48 дэкрэтаў Прэзыдэнта, выданых у часе, калі ня было Сойму. Сойм выслухаў у першым чытаньні і перадаў у камісію для замежных спраў цэлы рад трактатаў і ўмоваў з іншымі дзяржавамі.

Сойм разглядзеў і адаслаў у камісію праект аб дапамозе беспрацоўным. Урэшце Сойм у трэцьцім чытаньні прыняў законапраект аб пазыцы ў шведзкага „запалкавага караля“ Кругэра—пад заставу запалкавай манаполіі.

Сэнат меў адно пасяджанньне 13-I, на якім займаўся працай над уласнай арганізацыяй.

Бюджэтная камісія разглядзела ўжо каштарысы мін. унутраных спраў, прасьветы, рэлігіяў, публічных работаў, справядлівасьці, земляробства, мін. замежных спраў і зямельных рэформаў.

Цікаўная дыскусія мела месца ў бюджэтнай камісіі ў часе разгляду каштарысу мін. справядлівасьці. Як ведама, новы міністар справядлівасьці, гэта ж той самы былы прокурор, п. Міхалоўскі, які дазволіў, каб цывільныя вязьні былі пасаджаны ў ваенны вастрог — у Берасьці. Дзіва, што дыскусія аб бюджэце міністэрства ператварылася ў пратэст проціў „Берасьця“... Адзін па адным павадыры апазыцыйных клюбаў - у парадку ўсюды прынятай у парлямэнтах дыскусіі аб палітыцы міністра — пачалі крытыку яго паступаньня ў справе „Берасьця“, задаючы яму розныя пытаньні ў гэтай запраўды ж „гарачай“ справе. Але міністар Міхалоўскі заявіў рашуча, што прыйшоў у бюджэтную камісію, каб разглядаць спакойна і рачова свой бюджэт, дык—ні на якія палітычныя гутаркі і запытаньні адказваць тутака ня будзе, бо-ж для справы „Берасьця“ ёсьць спэцыяльная камісія.

Гэтая заява міністра выклікала цэлую буру з боку левай апазыцыі, прадстаўнікі якой пакінулі пасяджаньне камісіі. Прадстаўнікі эндэцыі, дык зусім не пайшлі на пасяджаньне—з пратэсту проці міністра.

Заграніцай.

Фінляндыя

У Фінляндыі 15. I. пачаліся прэзыдэнцкія выбары. Сьпярша ў Фінляндыі народ выбірае выбаршчыкаў, якія ўжо пасьля выбіраюць прэзыдэнта. Партыі, як пішуць, не пагадзіліся на адным кандыдаце, але выставілі кожная свайго. Але, быццам, найбольш паважным кандыдатам зьяўляецца стары дзеяч Сьвінхувуд. У кожным разе барацьба ўжо ідзе гарачая. Але—характэрна для высока-культурнай Фінляндыі, што выбарная кампанія праходзіць там у форме строгай законнасьці свабоды і парадку. Выбары—чыстыя і чэсныя, як хіба-ж мала дзе ў сучаснай Эўропе, асабліва на яе ўсходзе. Закон пануе над усімі — ня толькі над простымі сьмяротнымі, але і над урадам і ўрадоўцамі, навет—над генераламі!.. Варта ўспомніць тутака, як за ўчасьце ў „паляваньні“ навет на камуністаў былі пакараны магутныя спачатку „лапцаўцы“, таксама — за „ўвоз і схаваньне“ был. прэзыдэнта Фінляндыі (сацыял-дэмакрата!), арганізаванага нейкай „ваенна-лапцаўскай групай“, быў арыштаваны і звольнены з пасады і засуджаны на цяжкую кару навет сам начальнік генеральнага штабу фінляндскай арміі, скампраметаваны ў гэтым замаху!..

Чарговая сэсія Рады Лігі Нацыяў.

19. I. адчынілася ў Жэнэве чарговая—зімовая—сэсія Рады Лігі Нацыяў.

Гэтая сэсія выклікае асаблівую зацікаўленасьць, бо і яе праграма зьмяшчае вельмі вострыя справы і праца будзе праходзіць у варунках толькі што характэрна зьмяніўшагася міжнароднага палажэньня.

Найбольш вострым пунктам праграмы гэтай сэсіі Рады зьяўляецца, як ведама, скарга нямецкага ўраду на „гвалты над нямецкай меншасьцю ў Польскай Сілезіі—у часе выбараў у парлямэнт“.

Нямеччына мела намер „рашуча дабіцца ў Лізе прыкладнага пакараньня Польшчы“, як пісала нямецкая прэса.. Каб „разьвязаць сабе рукі“, як пракурору, нямецкі мін. Курцыус навет адмовіўся — на карысьць ангельскага мін. Гендэрсона—ад чарговага старшынства ў Радзе. Нямеч-

---

Ф. Акінчыц. Перадрук і пераклад забаронены.

На аграрныя тэмы.

(друкуецца, як дыскусыйны матэрыял).

(Працяг)

II. Сацыялісты.

Нам ня прыходзіцца дзівіцца тэй акалічнасьці, што буржуазныя партыі і сучасныя ўрады ня маюць вызначанай аграрнай праграмы, якая-бы мела на мэце задаволіць ня толькі патрэбы бяднейшай часткі насельніцтва, але забясьпечыць існаваньне ўсіх клясаў грамадзянства наагул. Нас павінна больш дзівіць тая акалічнасьць, што як раз гэтаму пытаньню аддаецца найменш увагі тымі партыямі, якія маюць намер пераарганізаваць грамадзянства на новых, сацыялістычных падставах.

Кожная сацыялістычная партыя маець аграрную праграму, але зьмест яе абмяжоўваецца пераважна аднымі яскравымі лёзунгамі дармовай канфіскаты буйных зямельных гаспадарак на карысьць безьзямельнага насельніцтва і г. д.

На гэтым, з нашага пункту гледжаньня, праграмы сацыялістычных партыяў застанавіцца ня могуць. Калі яны сапраўды імкнуцца ўвясьці ў жыцьцё сацыялістычны лад, то павінны перадусім заняцца падрабязнай распрацоўкай усіх пытаньняў, каторыя адносяцца да галіны рэканструкцыі ўсяе сельскае гаспадаркі ў цэласьці на сацыялістычных падставах.

Канфіската буйных маёнткаў і надзел зямлёй тых, хто мае ў гэтым патрэбу, не зьяўляецца яшчэ разьвязкай аграрнага пытаньня ў суцэльнасьці. Гэта нішто іншае, як паліатыў, каторы можа толькі часова задаволіць зямельны голад — і толькі.

Вялікім пытаньнем зьяўляецца яшчэ тое, ці наагул варта пушчаць пад мэханічны падзел культурныя гаспадаркі, якія дзякуючы такому падзелу могуць страціць эканамічную вартасьць. і ці ня будзе больш мэтазгодным пакінуць іх у недатыкальным відзе, перадаўшы ў уласнасьць усяго грамадзянства, а ня дзяліць на часткі і раздаваць іх у індывідуальную ўласнасьць паасобным сялянам.

Адным словам, вельмі шмат скамплікаваных пытаньняў павінна зьявіцца пры правядзеньні ў жыцьцё нават тэй мінімальнай праграмы, якая маець на мэце задаволіць у першую чаргу зямельны голад сельскага насельніцтва.

Калі дапусьціць, што на практыцы адбыўся-бы ўсеагульны перадзел земляў і поўная ліквідацыя буйнай зямельнай уласнасьці, то для нас зьяўляецца бессумліўнай тая акалічнасьць, што праз пэўную колькасьць гадоў пры старой, індывідуальнай сыстэме гаспадаркі, ізноў-бы мы знайшліся перад малаземельлем большасьці сялянскіх гаспадарак і іх слабой вытворчасьцю. Па меры натуральнага прыросту сельскага насельніцтва, якога так баяцца мальтузіянцы, — зямельныя надзелы драбнелі-бы і ўвесь час зьбліжаліся-б да такога стану, які зьяўляецца нічым іншы, як эканамічным абсурдам.

Нават у тым выпадку, калі-б быў праведзены адпаведны закон, па якім зямля пераходзіла-б па спадку ў рукі аднаго насьледніка, а не дзялілася-б паміж усімі, як гэта назіраецца цяпер ува многіх краёх — пытаньне ня было-бы развязана дзеля таго, што безьзямельнае селянства ня мела-б магчымасьці знайсьці „варштатаў працы“.

Апрача гэтага, такі спосаб прынёс-бы аграмадны, проста непасільны цяжар на неразьдзельную гаспадарку, якая павінна была-б траціць вялікія сродкі на расплату з насьледнікамі і тым самым скараціць да мінімума неабходныя расходы на сваё ўласнае палепшаньне і паднясеньне культурнага роўня. Такія гаспадаркі падупадалі-бы і вытворчасьць іх дайшлай-б да мінімума. Адным словам, ня можа быць сумліву ў тым, што просты перадзел зямлі нават на „параўнаўчых“ падставах, ня можа развязаць аграрнага пытаньня ўва ўсей яго поўнасьці.

Патрэбна больш грунтоўная і больш глыбокая рэканструкцыя ўсяе сельскае гаспадаркі, у якой галоўнай мэтай было-б паднясеньне вытворчасьці зямлі і працы сельскіх гаспадароў.

Прычына незадавальняючай тэорэтычнай распрацоўкі аграрнага пытаньня ў сучасных сацыялістычных партыях маець гістарычныя карані.

Сучасны навуковы сацыялізм мае сваім тэорытычным фундамэнтам навуку К. Маркса, каторы, як ведама, даў аналіз капіталістычных адносінаў пераважна ў галіне гарадзкой прамысловасьці. Калі ім ў III томе „Капіталу“, і зьвернена ўвага на аграрныя адносіны, то толькі на такія, каторыя зноў-жа носяць чыста капіталістычны характар.

Маркс не займаецца аналізам дробнае сялянскае гаспадаркі, як і пытаньнямі рэканструкцыі яе на сацыялістычных падставах.

Церезьмеру пільныя пасьледавальнікі навукі К. Маркса даўгі час былі пераканаными, што наагул няма ніякай патрэбы займацца аналізам аг-

чына цьвёрда разьлічала на сільную паддзержку з боку—ня толькі Італіі, але і Англіі. Таму ўсе спадзяваліся „агульнага і рашучага наступленьня Нямеччыны проці Польшчы". Курцыус меў намер быццам выкарыстаць справу „выбарных гвалтаў у Польскай Сілезіі", як сільны козыр для далейшай атакі—на польскія граніцы... Спадзяваліся, што Нямеччына, а за ёй і Італія — пры падтрыманьні Англіі—высунуць на гэтай эсіі і агульную справу—аб пераглядзе трактатаў... Усе дзяржавы, якія стаяць на груньце „непарушнасьці трактатаў і граніцаў" — з Францыяй на чале, — распачалі энэргічную акцыю проці нямецкіх рыхтаваньняў. І тутака — трэба сцьвердзіць — і-ноў баечна пашанцавала Польшчы!—Зусім „неспадзевана"—перад „рашучым наступам Нямеччыны на Польшчу"—становішча Англіі адносна да Францыі грунтоўна зьмянілася.

Справа ў тым, што Англія пераживае настолькі цяжкі эканамічны і фінансавы крызіс, настолькі вычарпаны залаты запас яе нацыянальнага банку, што ёй пагражае навет небясьпека краху валюты!.. А Францыя, як ведама, усьцяж багацее золатам, дый яшчэ зумысна вядзе такую фінансавую палітыку, каб усьцяж высысаць золата з Англіі. Такім чынам увесь „проці-французскі курс" Мак-Дональда пагражаў-бы Англіі валютным крахам.

Англіі—пад гэтай пагрозай і прышлося рашуча зьмяніць гэты курс і — прасіць пардону і помачы ў Францыі. Францыя—ведама ж—ахвотна згадзілася даць фінансавую дапамогу Англіі, але за гэта патрэбавала палітычных уступак... Мак-Дональд змушаны быў згадзіцца. Што Францыя патрэбавала паміж іншым і адмовы ад падтрыманьня Нямеччыны і Італіі ў іх наступу на Польшчу, дый на трактаты і граніцы наагул, гэта можна было прадбачыць згары. Таму і Нямеччына, страціўшы апору ў Англіі, зараз-жа „спусьціла тон".

Нямецкая прэса піша ўжо больш „цьвяроза", што—„сучасны мамэнт яшчэ не дасьпеў да парушэньня справы перагляду трактатаў". А побач з усім гэтым трэба спадзявацца і больш „лагоднай гутаркі" паміж міністрамі Курцыусам і Залескім у Радзе—у справе шлёнскіх выбараў...

Але ўсё ж, ня гледзячы на гэта, галосная дыскусія аб выбарных гвалтах на сусьветнай трыбуне не паслужыць для добрай апініі Польшчы, хаця-б навет нямецкая скарга значна згусьціла фарбы ў іх апісе...

Другая канфэрэнцыя ў справе „Пан-Эўропы".

16. I. адчынілася ў Жэнэве Другая Канфэрэнцыя ў справе так-званай „Пан Эўропы", ці „Злучаных Штатаў Эўропы". У запраўднасьці дзела ідзе пакуль што зусім не аб палітычным аб'яднаньні Эўропы, што, зразумела, яшчэ—„музыка далёкай будучыні", але ўсяго толькі — аб больш цесным і карысным для ўсіх гаспадарчым супрацоўніцтве, якое магло б памагчы ў барацьбе з агульна-эўрапэйскім эканамічным крызісам, а таксама—у барацьбе з нячуваным наступам на Эўропу з боку амэрыканскага капіталу.

У Жэнэву прыехалі дэлегаты 27 дзяржаў. Старшыня і пачынальнік канфэрэнцыі Брыян адчыніў яе працу прамовай, у якой даў жудасны абраз шалеючага ў Эўропе гаспадарчага крызісу, заклікаючы ўсіх сяброў канфэрэнцыі да згоднай працы. Пасьля Брыяна зараз-жа слова ўзяў нямецкі мін. Курцыус, які заявіў, што гаспадарчы крызіс у Эўропе ня можа быць зьліквідаваны без учасьця у працы эўрапэйскіх дзяржаваў—СССР. А таму — першым крокам канфэрэнцыі павінна быць запрашэньне на яе дэлегатаў СССР, а таксама і Турцыі. Нямецкага дэлегата падтрымаў і італьянскі мін. Грандзі—навет у вельмі катэгарычнай форме, дадаўшы—у бок Францыі,—што ніякая гаспадарчая праца ня зьліквідуе крызісу, калі ў Эўропе будзе існаваць такая няроўнасьць у ўзбраеньні розных дзяржаваў, якая пануе цяпер. Тады, пачуўшы, што ў паветры ўжо „пахне порахам", зараз-жа слова ўзяў ангельскі мін. Гендэрсон, які — запрапанаваў пачаўшае распаляцца пытаньне—перадаць у спэцыяльную камісію, якая і апрацуе наагул—праграму працы канфэрэнцыі.

Пытаньне аб запрашэньні СССР—вельмі вострае і можа разьбіць канфэрэнцыю. Тым больш, што ў самой Маскве лаюць усю гэтую „новую авантуру Брыяна" — што называецца! Радавая прэса піша, што гэтая „Пан-Эўропа"—„новая атручаная справа французскай імпэрыялістычнай кухні", прыпраўленая „выпрабаваным шулерам-авантурыстам" Брыянам—з адзінай мэтай: Гаспадарчага паходу проці СССР...

Ня кажучы ўжо аб цэлым радзе блізу няпрымірымых гаспадарчых, сацыяльных, палітычных і інш. розьніц і супярэчнасьцяў паміж буржуазнай Эўропай і СССР, адна толькі гэтая лаянка ў радавай, а гэта значыць і ўрадавай—прэсе на пачынальніка і галаву „пан-эўрапэйскай" канфэрэнцыі робіць вельмі цяжкім запрашэньне на яе дэлегатаў СССР.

Наколькі цяжкі крызіс і як цяжкая будзе з ім барацьба, ярка абрысаваў у сваёй прамове дэлегат Галяндыі ў камісіі канфэрэнцыі.

Ен сьцьвярдзіў, што за 4 гады працы Лігі Нацыяў па барацьбе з гаспадарчым крызісам палажэньне Эўропы не палепшылася, але пагоршылася! Таму народныя масы ў цэлым радзе краін ужо страцілі веру (калі мелі яе калісьці!) у працу Лігі... Калі і цяпер праца па зьліквідаваньню няспыняючайся ў Эўропе ўзаемнай гаспадарчай вайне таксама ня будзе мець пасьпеху, тады трэба сказаць згары, што Эўропе пагражае пагібель!..

Такім чынам праца канфэрэнцыі адчыняецца ў настроях, якія не варожаць асаблівага захапленьня і пасьпеху.

Кароткія навіны.

З СССР у Нямеччыну праз Рыгу — сухім шляхам — праехаў вялікі транспарт золата — усяго 116 скрыняў золата ў зьлітках і манэтах— па 2 пуды ў кожнай. Радавае золата вязлося у вялікім сэкрэце і пад добрай аховай з боку агентаў Г. П. У. Золата гэта мае хавацца ў сэйфах Бэрлінскіх банкаў.

Апошні раз праз Рыгу-ж было выслана з Масквы золата ў Лёндан — два гады назад, але тады было толькі 56 скрыняў.

— Газэты пішуць, быццам у Грэцыі ўсе больш расьце думка ў „народзе" (?) — аб павароце... манархіі. Быццам сучасны прэм'ер Вэнізэлос (!) выразна працуе за паварот былога караля Юрыя, якога, як ведама, народ выгнаў з краю — пасьля скандальнай вайны з Турцыяй у 1922 г. Быццам асабліва стараецца для гэтага экс-караля Юрыя Англія (ці-ж і сам галава „работніцкага" ўраду Мак-Дональд ?!.) якая, як ведама, і падбурыла гэтага дурнога, але пакорнага ей караля на няўдалую вайну з Турцыяй... Тады справа — зразумелая...

— Раённая вугальная забастоўка ў Англіі, у якой прымала ўчасьце некольк! сот тысяч вуглякопаў, мае скончыцца. Паразуменьне быццам ужо наступіла, ліквідацыя забастоўкі, спадзявана была ў пачатку тыдня. Але, як пішуць газэты, магчымы яшчэ і розныя неспадзеўкі.

— Дамаганьне французскіх камуністычных паслоў, каб урад безадкладна зьліквідаваў усе „белагвардзейскія арганізацыі" у Францыі, адкінена парлямэнтам.

— Мусоліні трыумфуе. Арганізаваная ім выправа цэлай эскадры аэрапляноў — праз Атлянтыцкі акіян — у Бразылію наагул удалася. З 15 самалётаў у сталіцу Бразыліі прыляцела 10. 5 лётчыкаў згінула.

Такі лёт цэлай эскадры праз акіян дакананы ўпяршыню.

Лёс б. Грамадаўцау.

Як ведама, правадыры Грамады ўлетку мінулага году былі звольнены з вастрогаў. Першым звольніўся Б. Тарашкевіч, за ім Бурсэвіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла і нарэшце апошнім выйшаў у ліпні месяцы Акінчыц.

У Равіцкім вастрозе застаўся толькі адзін Валошын, якога таксама мелі звольніць разам з іншымі.

Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Бурсэвіч і Мятла, як падавалі ўжо газэты, уцяклі заграніцу і гэтым самым затрымалі ў вастрозе Валошына.

Але справа ня ў адным толькі Валошыне.

У свой час былі засуджаны сотні б. грамадоўцаў на розныя кары і частка іх сядзіць яшчэ і да гэтага часу.

Есьць і такія грамадаўцы (з першага працэсу), якія былі звольнены пасьля апэляцейнага суда да разгляду іх справы найвышэйшым судом.

У свой час гэты апошні зацьвердзіў прысуд апэляцыйнага суда і гэтакім чынам людзей пабралі зноў у вастрогі.

Некаторыя сябры Грамады, выйшаўшы з вастрогу пасьля апэляцыі,—былі забраны ў войска, адбылі салдатчыну, а цяпер мусяць дакончываць сваю кару (напрыклад—Шкодзіч ды інш.).

З другога боку справа прадстаўляецца яшчэ і так.

Тыя з грамадаўцаў, якія былі зьвязаны з камуністычнаю партыяй, паўцяклі заграніцу, а засталіся тут пераважна тыя, якія ніякай сувязі з ёю ня мелі і цяпер ці-то адбываюць кару, ці ўжо яе адбылі.

Частка з адбыўшых кару таксама ўцякла заграніцу, а тыя, якім было не падарозе з камуністамі, засталіся на бацькаўшчыне.

Палажэньне гэтай апошняй групы даволі цяжкое: яны перадусім ня маюць грамадзкіх правоў (ня маюць выбарных правоў, ня маюць правы займаць пасады, гандляваць і г. д.). Некаторыя, навет, як напрыклад гр. Акінчыц, які адмовіўся ўцякаць заграніцу, да гэтага часу ня толькі пазбаўлены ўсіх правоў, але мае на руках „воўчы пашпарт", па якому мусіць мэльдавацца ў паліцыі, як толькі куды выяжджае і прыяжджае.

Усё гэта, разам узятае, даводзіць, што гэтаю справаю павінны зацікавіцца адпаведныя ўлады і раз назаўсёды яе вырашыць.

Трэба ўзяць пад увагу і тое, што ў свой час многа пісалася нават у польскай прэсе аб патрэбе поўнай ліквідацыі справы Грамады.

Патроху ліквідацыя яе йшла, але неяк затрымалася на паўдарозе. Цяпер палажэньне зусім высьвятлілася,—і тыя, якім было па дарозе з камуністамі, паўцяклі ў Саветы, а тыя, якія маюць адменныя пераканаеньні, засталіся тут.

Нам здаецца, што наступіў „найвышэйшы час", каб кіруючыя чыннікі зацікавіліся лёсам тых б. грамадаўцаў, якія нічога супольнага з камуністычнаю партыяй ня маюць, каб пазвальнялі іх з вастрогаў і ўпарадкавалі праўнае палажэньне тых, якія ўжо звольнены — і жывуць на нейкіх „воўчых правох".

рарных адносінаў дзеля таго, што знойдзеныя К. Марксам законы, маюць, паводле іх, ўсеагульнае значэньне і тым самым захопліваюць сабою галіну зямельных адносінаў.

Некалькі дзесяткаў год трывала палеміка марксістаў з рэвізіоністамі рознародных напрамкаў, дамагаючыхся падкапаць навуку Маркса ў гэтым балючым, здавалася-бы для яго мейсцы.

Артадоксы марксісты з сьляпым фанатызмам адбівалі напады „ворага" і зусім нічога не зрабілі для таго, каб расправаць аграрную тэорыю і хоць што небудзь унясьці ў сацыялістычную скарбніцу веды.

Да расейскай рэвалюцыі шмат марксістаў спадзявалася, што разьвіцьцё аграрных адносінаў пойдзе па пэўным шаблёне, які наглядаецца ў галіне прамысловасьці. Канцэтрацыя зямельнай уласьнасьці, пралетарызацыя селянскіх масаў і т.д. Сучасная аднак сапраўднасьць паказала, што ў галіне аграрных адносінаў гэтай якраз канцэтрацыі і пралетарызацыі не назіраецца ў такім маштабе, на які разьлічывалі некаторыя „прававерныя" марксісты.

Да гэтага часу мы маем у Эўропе цэлыя міліёны дробных селянскіх гаспадарак, лічба каторых за апошнія пасьлеваенныя гады павялічылася.

У многіх краёх, як напр. у Літве, Латвіі і іншых, буйныя маёнткі аказаліся распарцэляванымі. У другіх краёх гэты працэс парцэляцыі адбываецца ў больш павольныя тэмпе, як напр. у Польшчы, — і як агульнае правіла, нідзе не назіраецца прыросту капіталістычна арганізаваўшыхся лятыфундыяў. У Нямеччыне ад 1919 да 1925 распарцэлявана 192.000 гэкт. зямлі, у Чэха-Славацыі — да 1927 г. каля 1.400.000 гэкт. і т. д.

Такая парцэляцыя зьяўляецца гістарычнай неабходнасьцю і няма тэй сілы, якая-б магла яе затрымаць.

Адносіны сацыялістычных партыяў да парцэляцыі буйнай уласнасьці даволі нявыразныя. Тэорыі, каторых яны прытрымліваюцца, кажуць адно, а сучаснае жыцьцё паказывае зусім іншыя тэндэнцыі, дзеля чаго і назіраецца ў аграрнай палітыцы сацыялістаў „зыгзагі" і пярэчаньне нават у такім пытаньні, як парцэляцыя.

Нямецкія сацыялісты напр. у сваёй навейшай аграрнай праграме 1928 г. пастанавілі, што парцэляцыі маюць падлягаць маёнткі, перавышаючыя пэўны „гаспадарскі оптымум", каторы ў усходняй Нямеччыне вызначылі ў 700 гэкт.

У 1919 г. тая самая нямецкая сацыял.-дэмакратычная партыя прызнавала парцэляцыю зямель зусім без усялякіх абмяжаваньняў.

Польскія сацыялісты ня маюць яшчэ вызначанага пагляду на гэта пытаньне, хаця P.P.S. выступае з соймавай трыбуны з праектамі парцэляцыі зямлі без абмяжаваньняў.

Разьвіцьцё капіталістычных адносінаў мае на вёсцы свой спэцыфічны характар і абмяжоўваецца галоўным чынам закабаленьнем сялянскага насельніцтва ў руках ліхвяроў і розных спэкулянтаў. Такім чынам у нас няма ніякіх падстаў разлічываць на тое, што разьвіцьцё такога роду капіталістычных адносінаў паслужыць фундамантам, на каторым могуць зьявіцца тыя вынікі, каторыя прывялі-бы нас да больш рацыянальнай арганізацыі сельскае гаспадаркі.

Ліхвярскі капітал высысае сокі з працоўнага насельніцтва, даводзячы яго да беднасьці і толькі. Роля яго шкодная, зьніштажаючая і ніякіх творчых, канструктыўных падстаў у сельскую эканоміку ён ня ўводзіць.

Найлепшым сродкам проціў гэтага капіталу зьяўляецца крэдытная кооперацыя, і мы бачым, што ў тых мейсцах, дзе яна разьвіваецца—ліхвярскі капітал уступае ей сваё мейсца. У сацыялістычнай літэратуры, пасьвячонай аграрнаму пытаньню, заслужанай увагай карыстацца праца К. Каўцкага. Аднак у сваім „Аграрным пытаньні" ён ня дае яснае і вызначанае разьвязкі гэтага якраз пытаньня.

Ён падобна іншым марксістам пакладае вялікія надзеі на разьвіцьцё капіталізму ў сельскай гаспадарцы і тым самым паколькі гэтыя надзеі ня зьдзейсьніваюцца, ня дае ніякага па сутнасьці адказу.

Яго адносіны да кооперацыйнага будаўніцтва ў межах буржуазнага ладу адмоўныя і ён зусім беспадстаўна лічыць, што кооперацыя ў сельскай гаспадарцы ня мае ніякай будучыні і павінна ператварыцца ў капіталістычныя формы.

Кооперацыйная практыка многіх краёў, асабліва ў Даніі паказала аднак поўную беспадстаўнасьць падобнага роду гістарычных прагнозаў. У частцы сваёй працы, пасьвячонай распрацоўцы пэўных мераў, каторыя павінны быць праведзены сацыял - дэмакрацыяй у тым выпадку, калі-б яны аказаліся пры ўладзе, мы не знаходзім такіх мераў, каторыя-б давялі да сапраўднай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў агульна-дзяржаўным маштабе.

Паводле Каўцкага селянін вельмі хутка зразумее пераважнасьць буйнае гаспадаркі і „з радасьцю"—як ён кажа—„пакіне свой уласны кавалачак землі", на каторым галадае і пяройдзе ў калектыўную гаспадарку.

(Далей будзе).

З жыцьця Савецкай Беларусі.

Усё аб адным.

Камуністычная прэса Савецкай Беларусі атрымала загад ад кіруючых вярхоў „дабіваць“ беларускіх культурных і грамадзкіх дзеячоў, абвінавачваючы іх нямаведама ў чым. Трэба падгатаваць апінію савецкай „грамадзкасьці“ да хуткай расправы з імі — і гэтае заданьне з пасьпехам выконвае савецкая прэса.

„Контр-рэвалюцыйная група нацыянал-дэмакратаў Смолічаў, Лёсікаў, Ластоўскіх, Некрашэвічаў“—піша напр. „Савецкая Беларусь“ (№ 2 ад 2 студзеня г.г.): „гэтых агентаў польскай ахранкі, саюзьнікаў шкодніцкіх банд тыпу Рамзіна, Кандрацьева, Громана — ўсімі сіламі, усімі способамі імкнулася затармазіць, сарваць сацыялістычнае будаўніцтва, перашкодзіць росту пралетарскай беларускай культуры.

Гэтакім чынам мы даведаліся, што Лёсік з Ластоўскім і іншымі ня толькі зьяўляюцца агентамі польскай паліцыі, але што яны перашкаджалі росту беларускай культуры!

Як-жа тут не саджаць такіх шкоднікаў у лёхі „чрэзвычайкі“ і не дамагацца „вышэйшай меры социяльнага забясьпечаньня“, па просту гаворачы, кары сьмерці...

Такой нагласьці і цынізму, здаецца, яшчэ сьвет ня бачыў.

Савецкі Сталыпін.

Жыў сабе на Беларусі скромны чалавечак, Прышчэпаў. Каб зрабіць кар'еру — запісаўся ў камуністы і адразу, як кажуць, павязло: назначылі камісарам зямельных спраў. Выконваў усё тое, што приказвалі з гары. Прыйшоў загад „даёшь хутары“ — і зьявіліся хутары ў колькасьці, якой пазайздросьціў-бы нават сам Сталыпін.

Камуністычная партыя, памагаючы Прышчэпаву—ўстанаўляла, як нам ведама, нават „месяцы хутарызацыі“ — калі ўсе камуністычныя рэзэрвы кідаліся на вёску, каб як найхутчэй схутарызаваць селянства. Праца кіпела—і амаль ня ўся Беларусь накрылася хутарамі.

Але падыйшоў хутка „новы курс“... у камуністычнай партыі. Зьявіўся сталін з сваёй калектывізацыяй. Пачалі разбураць хутары і заганяць народ ў камуны. Праца аказалася нялёгкай, дзякуючы хутарскому землякарыстаньню.

Успомнілі, што ёсьць такі Прышчэпаў, які схутарызаваў вёску. „Вінавайцу“ раней выкінулі з партыі, потым схапілі і пасадзілі ў вастрог, а на дадатку „прышылі“ нацыянал-дэмакратызм.

Сядзіць цяпер прышчэпаў у Менскім вастрозе, а камуністычныя гэршты нацкоўваюць на гэтага чалавечка сваё грамадзянства.

„У справе правядзеньня сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Савецкай Беларусі—кажа А. Хацкевіч—сэкрэтар Бел. Ц. В. К.—спаткалася з г. зв. „прышчэпаўшчынай“, Нар. Камісарыят Земляробства і яго органамі на месцах скрыўлялася палітыка партыі і ўраду, доўгі час праводзілася яўна кулацкая лінія і палітыка ў сельскай гаспадарцы. Нават у апошнія гады замест рашучага курсу на шырокую калектывізацыю... працаўнікі Нар. Кам. Зем. праводзілі хутарызацыю, тварылі карлаватыя пасёлкі і г. д.“ („Известия“ № 11—1931 г.).

Нават з гэтага відаць, які вялікі хаос пануе ў Савецкіх Рэспубліках у аграрнай галіне.

Але цікава і тое, што хутарызацыя праводзілася, як прызнае сам Хацкевіч, доўгі час і выходзіць з яго слоў так, што ні компартыя, ні Чэрвякоў гэтага не заўважылі.

Бедныя савецкія стрэлачнікі! — За ўсё ім прыходзіцца нясьці адказнасьць.

Хроніка.

— **Беларускі Краязнаўча-Турыстычны Гурток у Вільні.** У нядзелю 18-га студзеня б. г. паўстаў да жыцьця Беларускі Краязнаўча-Турыстычны Гурток пры Бел. Навуковым Т-ве. Патрэба Краязнаўча-Турыстычнае арганізацыі даўно адчувалася ў Зах. Беларусі, але нажаль той нэрвовы тэмп жыцьця, у якім прыходзіцца беларусам працаваць, адсоўваў гэтую, вельмі патрэбную галіну працы, на другі плян.

Па прачытаньні рэфэрату д-рам Мік. Ільяшэвічам на тэму „Краязнаўства і Турыстыка“ ў вышэй азначаны дзень, прыступілі сябры Навуков. Т-ва і зацікаўленыя Краязнаўча-Турыстычнай працай госьці, да закладзінаў арганізацыі. Пакуль што Белар. Краязнаўча-Турыстычны Гурток зьяўляецца філіяй Бел. Навуковага Т-ва і будзе працаваць у рамках прадугледжаных статутам Нав. Т-ва. Аднак дзеля прадукцыйнасьці ў працы выпрацуе свой рэгулямін і ў бліжэйшы час выступіць на шырэйшае поле. Пакуль што абраны тымчасовы ўрад Бел. Краязнаўча-Турыстычнага Т-ва: Д-р Мік. Ільяшэвіч—старшыня, паруч. Казлоўшчык—сэкрэтар, Д-р Станкевіч, Кэпэль, Шчасны, мастак Я. Драздовіч і Войцік—сябры. На сяброў Бел. Краязнаўча-Турыстычнага Т-ва пакуль што запісалася 25 асоб. Запіс трывае й далей у памешканьні Беларускага Музэю ім. Ів. Луцкевіча Вільня, Вострабрамская № 9, ад 9—12 гадз. штодня апрача нядзель і сьвятаў.

— **Беларускі Цэнтрасаюз.** На апошнім пасяджаньні прэзыдыюму Цэнтрасаюзу, якое адбылося 22 г. месяца—быў зацьверджаны конкрэтны плян культурна асьветнай працы на бліжэйшы час. Ня гледзячы на цяжкі матэрыяльны стан, у якім знаходзіцца Цэнтрасаюз, пастаноўлена прыступіць да арганізацыі на правінцыі бібліятэк-чытальняў.

У першую чаргу мае быць наладжана ў розных паветах 10 бібліятэк пераважна ў тых месцах, дзе мясцовае грамадзянства дае бясплатнае памяшчэньне.

Бібліятэкі Цэнтрасаюз купляе ў Выд. Т-ве і высылае на правінцыю на льготных умовах (крэдыт на 6 месяцаў і г. д).

У наступную чаргу мае быць адчынена яшчэ да 50 бібліятэк. Акрамя гэтага, з лютага месяца с. г. будуць наладжаны лекцыі на правінцыі — гр. Акінчыц будзе чытаць даклады на коопэратыўныя тэмы і інж.-аграном Бусел на грамадзка-агранамічныя. Такіх лекцыяў што месяц будзе прачытана ня менш пяці ў тых месцах, адкуль будуць запатрэбаваньні.

Далей Цэнтрасаюз бярэ на сябе арганізацыю драматычных гурткоў, апрацоўку пляну іх працы і праўную дапамогу.

Трэба спадзявацца, што нашае грамадзянства прыйдзе з дапамогаю Цэнтрасаюзу у гэтай карыснай для нашай справы працы.

— **Беларускія жанчыны арганізуюцца.** Даўно ўжо адчувалася ў нас вялікая патрэба жаночае арганізацыі. І вось цяпер гэта зьдзейсьнілася.

Статут жаночае арганізацыі, якая носіць назоў „Аб'еднаньне Беларускіх Жанчын імя Алёізы Пашкевічанкі (Цёткі), ўжо зацьверджаны. Пакуль што статут зацьверджаны толькі на Віленскае Ваяводзтва, але Урад Аб'ядн. Бел. Жанчын, робіць ужо захады аб пашырэньні яго і на іншыя Ваяводзтвы.

Па зацьверджаньні статуту адбыўся дня 11. І. г. г. Арганізацыйны Сход, на якім былі выбраны Урад і Рэвізійная Камісія, а таксама быў абгавораны і намечаны плян працы ў бліжэйшай будучыні.

Склад Ураду і Рэвізійнае Камісіі, а таксама больш шырэйшыя інфармацыі аб „Аб'ядн. Белар. Жанчын імя А. Пашкевічанкі“ (Цёткі) будуць паданы ў наступным нумары газэты „Беларускі Звон“.

Лекцыі ў Вільні. У нядзелю 25 студзеня гр. Ф. Акінчыц у Студэнцкім Саюзе (Віленская 8) прачытаў першую лекцыю па аграрнаму пытаньню.

Такіх лекцыяў будзе некалькі і наступная адбудзецца 1 лютага а 4 гадзіне ў тым-жа памяшчэньні.

У першай лекцыі гр. Акінчыц даў агляд мерапрыемстваў у аграрнай галіне сучаснымі дзяржавамі і прыступіў да крытыкі сацыялістычных праграмаў. У наступных лекцыях будзе прадоўжэньне гэтай крытыкі і разгляд савецкай аграрнай палітыкі.

Тэатральныя гурткі. З вёсак даходзяць весткі, што шмат у якіх мейсцах існуюць магчымасьці да арганізацыі тэатральных гурткоў, але яны не арганізуюцца дзеля таго, што мяйсцовае грамадзянства спатыкае розныя перашкоды фармальнага характэру з боку адпаведных уладаў.

Як мы даведаліся, прэзыдыум Цэнтрасаюзу на адным са сваіх пасяджаньняў пастанавіў зьвярнуць увагу на гэтую. справу і прыйсьці дапамогаю грамадзянству

Дзеля гэтага трэба, каб там дзе ёсьць адпаведныя ўмовы і сілы для наладжаньня спэктакляў — зацікаўленыя асобы зьярталіся ў Цэнтрасаюз.

— **Віленскае радыё і Беларусы.** Існуе ў Вільні разгалосьня польскага радыё. Пераважная частка праграмы віленскага радыё гэта музыка з грамафонных плытаў, патрыятычныя лекцыі „на злобу дня“, а рэшта рэтрансмісыі з іншых станцыяў, а галоўным чынам, з Варшавы. Скολькі-б ня прыслухоўваўся беларускі абонэнт, нічога свайго беларускага тут не пачуе. Дзіўна трактуе дырэкцыя віленскага радыё тутэйшае грамадзянства, ўважаючы яго мусіць выключна за польскае, бо абсалютна выключае з свае праграмы беларускія патрэбы. А трэба-ж прыпомніць дырэкцыі віленскага радыё, што ў Польшчы, і то галоўнае ў гэтым краі, жыве нават па польскай урадовай статыстыцы, каля двух міліёнаў беларусаў (1.600.000).

Як ня дзіўна, але чэскае і нават нямецкае радыё, ня кажучы ўжо пра латвійскае і радавае шмат удзяляе мейсца беларускім запатрабаваньням. Ці не пара-б было дырэкцыі віл. радыё падумаць аб увядзеньні ў праграму адпаведных гадзінаў і дзён для патрэбаў беларускага грамадзянства і запрасіць дзеля гэтага адпаведныя компэтэнтныя беларускія сілы?

Рэдактар-выдавец: **М. Сіняўскі** Друкарня Я. ЛЕВІНА Вільня, Нямецкая 22.